Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№39 (277) 26 верасня — 2 кастрычніка 2002г. Наклад 11.700 экз. Кошт 300 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ
Слонім,
Зэльва,
Дзятлава,
Масты,
Ваўкавыск,
Шчучын,
Ліда,
Гродна,
Баранавічы,
іншыя гарады Беларусі,
а таксама на HTTP://gs.promedia.by

ПРИШЛИ, ЧТОБЫ ПОДРУЖИТЬСЯ

Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

По инициативе психолога СШ №1 Оксаны Борисевич, ребята 5 "А" класса пришли в субботу, 21 сентября, в Слонимский детский дом, чтобы поближе познакомиться и подружиться с его воспитанниками.

Оксана Петровна провела с ребятами ряд развлекательных игр, конкурсов. Она подала идею для остальных школ города сделать традиционными встречи с ребятами Слонимского детского дома.

Ольга ШИНКЕВИЧ

НАВІНЫ

ДАЛУЧЭННЕ АДБЫЛОСЯ

На сесіі Слонімскага раённага савета дэпутатаў, якая адбылася 18 верасня, стала вядома, што прынята рашэнне аб далучэнні мясцовага рознічнааптовага плодаагароднінная прадпрыемства АГФ "Шчара" да Слонімскага райспажыўсаюза.

"ГС"(№37) аб гэтым ужо пісала. Але, як вынікае, у Слонімскім райвыканкаме не падтрымалі калектыў РАПП, які жадаў працаваць самастойна і быў супраць далучэння да райспажыўсаюза. Хаця аб'яднанне зроблена ў мэтах павышэння эфектыўнасці нарыхтоўчай дзейнасці, паляпшэння забеспячэння насельніцтва, арганізацый і ўстаноў прадаагароднінай прадукцыяй.

Што ж, пажывем — пабачым. Хвалюе людзей: ці застануцца з працаю 52 работнікі плодаагароднінная прадпрыемства?

Сяргей ЧЫГРЫН

ПРАБЛЕМА

ПЕШШУ Ў ШКОЛУ

Пачатак навучальнага года пакрыху ставіць праблемы перад дзецьмі, якія жывуць не ў горадзе, а, напрыклад, у вёсцы Чамяры.

Справа ў тым, што рэйсавы аўтобус з Чамяроў на Слонім адпраўляецца ў 7.20, а заняткі пачынаюцца а палове дзявятай гадзіны раніцы. Паўстае дылема — ехаць на аўтобусе і чакаць амаль гадзіну пад дзвярыма школы, бо раней як за пяць хвілін да пачатку заняткаў дзяцей у памяшканне школы не пускаюць? Альбо дабірацца да горада пешшу і такім жа чынам вяртацца дамоў?

Цяпер, пакуль не халодна, можна і прагуляцца замест актыўнага адпачынку. А што будзе зімой? Вось гэта па-сапраўднаму і турбуе бацькоў чамяроўскіх школьнікаў.

Валерый КАВАЛЕНКА

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!
На "Газету Слонімскую" можна падпісацца ў рэдакцыі да 30 верасня па адрасе: вул. Камсамольская, 8

Курсы обмена валют в г. Слониме по состоянию на 10^{00} 24.09.2002г.

"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1850	1880
1 EURO	1800	1850
1 RUR	57	60
оао "Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1860	1875
1 EURO	1810	1845
1 ZL	440	460
1 RUR	57,5	59,5
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1840	1877`
1 EURO	1790	1820
1 RUR	57	59
Нацбанк РБ		
1 USD	1862	
1 EURO	1832,86	
1 RUR	58,86	



НАВІНЫ

ПРЫНЯТЫ Ў САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Наш зямляк, намеснік галоўнага рэдактара "Газеты Слонімскай" Сяргей Чыгрын прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў.

Нагадаем, што Сяргей Чыгрын нарадзіўся ў вёсцы Хадзявічы Слонімскага раёна. Скончыў Магілёўскае культасветвучылішча і Белдзяржуніверсітэт. Першы верш "Свяціць сонейка" быў апублікаваны ў часопісе "Бярозка". Выступае ў беларускім і замежным друку не толькі як паэт, але і як перакладчык, краязнавец, літаратуразнавец і, вядома ж, як журналіст. На беларускую мову пераклаў пасобныя вершы французскіх і ўкраінскіх паэтаў, а таксама п'есы А.Хайта, К.Манье, Э.Успенскага, К.Гальдоні, А.Астроўскага, С.Міхалкова і іншых аўтараў. Усе яны пастаўлены на сцэне Слонімскага беларускага драматычнага тэатра.

У 1993 годзе выйшла з друку кніжка"Янка Купала і Слонімшчына", зборнікі паэзіі "Шчырая Шчара" (1993) і "Горад без цябе" (1999). У Беластоку асобнаю кнігаю выдаў літаратурную спадчыну Станіслава Грынкевіча, Франука Грышкевіча і Ўладзіслава Казлоўшчыка пад назваю "Вяртанне да сваіх". Сёлета выхаду ў свет у Беластоку чакае падрыхтаваная Сяргеем Чыгрыным гістарычная спадчына Міколы Шкялёнка "Беларусь і суседзі", а ў Беларусі — кніга нарысаў "Бясконцы шлях дадому".

Прынамсі, Сяргей Чыгрын з'яўляецца сябрам Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, а таксама ўзначальвае Слонімскую філію Беларускай асацыяцыі журналістаў.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

ГОРЯТ МАШИНЫ

В прошлый четверг на переулке 2-м Лесном загорелся автомобиль «Форд-Темпра» 1992 года выпуска.

Огнем поврежден капот, крылья, двигатель и салон автомобиля.

А двумя днями позже, 21 сентября, вспыхнул джип «Опель» по ул.Котовского. Пламя частично повредило салон машины, а также электрооборудование.

Причины пожаров и нанесенный ущерб устанавливаются.

ГРАНАТУ ОБЕЗВРЕДИЛИ

Ребята из деревни Мельканович Слонимского района нашли на поле боевую гранату Ф-1.

Два дня "находку" охранял местный участковый, ожидая, пока из командировки вернется сапер инженерно-саперного батальона 11-й отдельной механизированной бригады.

Спустя два дня гранату все-таки обезвредили.

ОТ БАНИ ОСТАЛИСЬ ТОЛЬКО СТЕНЫ

Из-за нарушений правил пожарной безопасности в деревне Комлевичи Слонимского района загорелась деревянная баня.

Так как телефона в деревне ни у кого нет, то о пожаре сообщили слишком поздно. Постройку практически не удалось спасти. От бани остались только стены.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ШКОЛА

ЯК АТРЫМАЦЬ ДЗЕСЯТКУ?

Тэорыя

Школьная рэформа закранула сёлета адну з найбольш устаялых складаючых адукацыі — сістэму ацэнкі ведаў і навыкаў вучняў. З пяцібальнай гэтая сістэма вырасла да дзесяці балаў.

Каб атрымаць адказ на вынесенае ў загалоўку пытанне і ўбачыць на практыцы, як працуе дзесяцібальная сістэма школьных адзнак, карэспандэнт "ГС" пабываў у Слонімскай СШ №8.

Як адзначыў дырэктар школы Іван Міхальчэня, сэнс рэформы агульнаадукацыйнай школы палягае ў тым, каб ад назапашвання ведаў перайсці да іх творчага асэнсавання і выкарыстання на практыцы, у жыцці. І ў гэтым плане дзесяцібальная шкала адзнак забяспечвае гуманістычны, індывідуальны падыход настаўніка пры ацэнцы ведаў, навыкаў, здольнасцяў і, адпаведна, магчымасцяў таго ці іншага вучня.

Але, як і ўсякае новаўвядзенне, новая сістэма школьных адзнак успрымаецца з насцярогай. І ў першую чаргу бацькамі вучняў, якія па пяцібальнай сістэме вучыліся на 4 – 5. Па дзесяцібальнай шкале колішняй чацвёрцы адпавядае шасцёрка, а пяцёрцы — дзевятка. Такая варыяцыя станоўчых адзнак дае магчымасць настаўніку больш аб'ектыўна ацэньваць узровень ведаў вучня і яго ўменне аперыраваць матэрыялам. Аднак для бацькоў васьмёрка (амаль выдатна) — гэта ўсё ж не колішняя пяцёрка. І ў іх узнікае пытанне: няўжо маё дзіця стала вучыцца горш? І пакуль пройдзе перыяд адаптацыі, прывыкання да новай шкалы адзнак, падобныя пытанні будуць узнікаць. А дзеці тым часам вучацца і атрымліваюць і васьмёркі, і дзевяткі, і дзесяткі. Хоць апошняя адзнака выстаўляецца досыць рэдка.

Практыка

На ўрок беларускай літаратуры да настаўніцы Алены Іванаўны Герасімчык у 4 "Б" клас аўтар гэтых радкоў і завуч школы прыйшлі без папярэдняй дамоўленасці. Тым самым элемент магчымай паказухі быў адразу выключаны.

І так, звычайны ўрок. Павітаўшыся, настаўніца перадала слова вучням. Аказалася, што, акрамя вучэбнага матэрыялу па падручніку, дзеці дома рыхтавалі конкурс "Лепшае апавяданне для сяброў". Такім чынам вучні самастойна знаёміліся з новымі імёнамі ў беларускай літаратуры. Заданне творчае, сітуацыя незнаёмая (клас рускамоўны): патрэбна знайсці твор, прачытаць, падрыхтаваць пераказ, і пры гэтым апавяданне павінна спадабацца аднакласнікам, каб яны не толькі паслухалі, але і прынялі ўдзел у абмеркаванні. Калі глядзець па шкале дзесяцібальнай сістэмы, то ў поўным аб'ёме выкананае, такое заданне заслугоўвае адзнакі дзесяць. На ўроку ж выйшла, што за прадстаўленыя сябрам апавяданні Васіля Віткі "Зайчык-вадалаз" і Цёткі "Міхаська" двое вучняў атрымалі па дзевятцы. І паставілі ім гэтую адзнаку... аднакласнікі. Самі дзеці ўжо цудоўна разумеюць вартасць кожнай адзнакі па дзесяцібальнай сістэме. А дзесятку не паставілі сваім сябрам толькі таму, што пры пераказе ў іх праскоквалі рускія словы. Спрацавала спецыфіка прадмета ў класе з рускай моваю навучання.

Тым часам урок працягваўся. Наступнай яго часткай была праверка дамашняга задання — выразнае чытанне і аналіз верша Уладзіміра Караткевіча "Бацькаўшчына". Адзнака шэсць, якую настаўніца паставіла аднаму з вучняў па чытанне верша, аказалася блізкай да таго, як працу дзяўчынкі ацанілі вучні — некаторыя прапаноўвалі паставіць ёй шасцёрку, іншыя — сямёрку...

Школьніцы 11 класа СШ №8 г.Слоніма рыхтуюцца атрымліваць дзесяткі

Фота Віталя ГІЛЯ

Той урок не паказаў, што ў настаўніцы ці ў вучняў ёсць нейкія праблемы з дзесяцібальнай сістэмай адзнак. Але, адказваючы на пытанне,"Як вам працуецца з дзесяццю баламі?", Алена Іванаўна прызналася, што хоць гэтая сістэма не выклікае ў яе асаблівай цяжкасці, але міжволі, "пра сябе", яна параўноўвае пастаўленую вучню адзнаку да пяцібальнай сістэмы. Таксама, як і дзеці, і іх бацькі. Алена Іванаўна не баіцца ставіць дзецям высокія адзнакі, калі тыя іх заслугоўваюць. У дзевятым класе за крыжаванку па творчасці Янкі Купалы настаўніца паставіла вучням дзесяткі. А гэта на бал больш, чым колішняя пяцёрка.

Так што выдатнікам можна радавацца. Праўда, для гэтага патрэбна многа і творча працаваць.

І напрыканцы хацелася б нагадаць, што дзесяцібальная сістэма адзнак некалькі гадоў праходзіла эксперыментальныя выпрабаванні ў асобных школах (у Слоніме, напрыклад, у СШ №9) і цалкам сябе апраўдала. Двоечнікі, практычна, зніклі. Бо каб атрымаць двойку пры дзесяцібальнай сістэме — патрэбна пастарацца. А выпускнікі-выдатнікі, якія вучыліся на 9 -10, у ВНУ паступалі на такіх жа ўмовах, як і выдатнікі-пяцёрачнікі.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЭКОЛОГИЯ

КТО УКРАЛ ЧЕМЕРОВСКОЕ ОЗЕРО?

Две недели назад жители деревни Чемеры Слонимского района не обнаружили на старом месте озера, которое располагалось в конце деревни возле леса.

Двадцать лет назад его "сделало" огородно-товарищеское общество "Камвольщик", собрав деньги с дачников.

И вот несколько недель назад озера не стало. Видимо, его спустили ночью. И теперь о том, что ранее здесь был водоем, напоминают лишь заросли камышей. А то, что осталось от озера, можно назвать большой лужей.

Житель Чемеров Валерий рассказал, что он каждый вечер ходил купаться на озеро, а теперь вот этого не сделаешь. А рыбы там было немного, так как, по словам Валерия, "горе-рыбаки в последнее время слишком много сетей ставили".

Люди теряются в догадках: кому понадобилось спускать озеро?

У дачников слишком много неудобств появилось в связи с этим: где же теперь брать воду? Когда спустили озеро, ушли грунтовые воды, поэтому колодцы многих дачников практически высохли.

Красивое озеро превратилось в большую лужу

Фота Вольгі ШЫКЕВІЧ

По словам участкового инспектора Озгиновичского сельского совета Владимира Цвикевича, уголовное дело в связи со спуском озера не будет возбуждено, так как материальный ущерб не был причинен. Как отметил Владимир Петрович, рыбу в озере специально не разводили.

Поэтому, скорее всего, никто так и не будет выяснять, кто украл у людей чемеровское озеро.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗДАРЭННІ

ПЛЯМЕННІК ЗАДУШЫЎ СВАЮ ЦЁТКУ

Нядаўна ў Слоніме ахвяраю 33-гадовага слонімца стала яго 71-гадовая цётка, якую злачынца па-зверску задушыў у яе асабістай кватэры.

Калі ў кватэру жанчыны пазваніў яе сваяк, яна спакойна яго ўпусціла. Дачакаўшыся моманту, забойца дзвюма рукамі схапіў за шыю жанчыну і пачаў душыць. Дадушваў яе ўжо ручніком. Убачыўшы, што цётка ўжо мёртвая, ён узяў новы тэлевізар "Гарызонт", а таксама тэлефон, зачыніў кватэру і... знік. На рынку забойца хутка прадаў тэлефон, а таксама за 40 тысяч новы тэлевізар. За выручаныя грошы ён планаваў адзначыць свой дзень нараджэння.

Мёртвую жанчыну выявіла сястра. Яна адразу звярнулася ў міліцыю, супрацоўнікі якой праз гадзіну затрымалі раней тройчы судзімага забойцу. Па гэтаму факту ўзбуджана крымінальная справа.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗОЛАТА ЗНІКЛА З КВАТЭРЫ

З заявай у міліцыю звярнулася жыхарка вёскі Васілевічы Слонімскага раёна Н. Жанчына паведаміла, што з яе кватэры зніклі два залатыя ланцужкі.

Па гэтаму факту ўзбуджана крымінальная справа.

ЦЯЛЯ ПАМЯНЯЛА ГАСПАДАРА

Жыхар вёскі Жыровічы В. 16 верасня паведаміў у міліцыю, што з выгана з хатай у яго прапала цяля.

Праз некалькі дзён прапажу выявілі ў адной мясцовай жыхаркі, і цяпер міліцыя правярае, якім чынам цяля здрадзіла сваіму гаспадару.

РЭВІЗІЯ НА СКЛАДЗЕ

У міліцыю паступіла паведамленне, што ў ноч на 18 верасня невядомыя праніклі ў калгасны склад у вёсцы Пятралевічы і вынеслі адтуль матэрыяльных каштоўнасцяў прыкладна, на 50 тысяч рублёў.

Работнікі міліцыі праводзяць праверку.

ГАРАДЖАНКА КРАЛА Ў КАЛГАСЕ

На мінулым тыдні работнікамі аб'яднання "Ахова" была затрымана сланімчанка І., якая на працягу бягучага года ўчыніла паўторны крадзёж сельгаспрадукцыі ў калгасе "Уперад".

Цяпер работнікі міліцыі правяраюць, у якіх памерах гаспадарцы быў нанесены матэрыяльны ўрон. А ад гэтага залежыць, якое пакаранне панясе злоўмысніца — адміністратыўнае ці крымінальнае.

ГАЛОДНЫЯ САБАКІ ЗАГРЫЗЛІ КОЗАЎ

Жыхар з вуліцы імя Катоўскага ў Слоніме паведаміў у міліцыю, што днём, 20 верасня, з 14 да 16 гадзін бадзячыя сабакі загрызлі дзвюх яго козаў.

Гаспадару, сапраўды, не пашчасціла. Бо спытаць за панесеную страту няма ў каго. Тым часам тэма бяздомных сабак даўно стала актуальнай для Слоніма.

ЦЕШЧА І АЎТАМАБІЛЬ

22 верасня з заявай у міліцыю звярнуўся сланімчанін Г., які паведаміў, што цешча разбіла ў яго аўтамабілі лабавое шкло.

Міліцыя высвятляе матывы ўчынку жанчыны.

Мікола КАНАНОВІЧ

ГОРАД

САМЫ ДЭМАКРАТЫЧНЫ ВАКЗАЛ

Фота Віталя ГІЛЯ

У дарожнікаў працы хапае

На аўтобусных пляцоўках слонімскага вакзала дарожнікі кладуць асфальт. Хутка вадзіцелям не патрэбна будзе старанна аб'язджаць яміны, а пасажырам глядзець пад ногі, каб не патрапіць у лужыну з вадой. Добраўпарадкаванне тэрыторыі вакзала, як і іншых гарадскіх вуліц, сёлета лагічна ўпісалася ў святкаванне 750-годдзя Слоніма.

У тым, што за адносна кароткі прамежак часу горад папрыгажэў, памаладзеў, бясспрэчна, ёсць заслуга мясцовых уладаў і асабіста старшыні Слонімскага райвыканкама Мечыслава Касцюка. Такое меркаванне выказваюць многія слонімцы. І яны, відаць, маюць рацыю. Бо рамонту і добраўпарадкавання ў такім аб'ёме, як сёлета, Слонім ужо даўно не бачыў.

Але вернемся на слонімскі вакзал. Ёсць там адзін камунальны аб'ект, які, нягледзячы на тое, што яго, не любіць ніхто, але цярпець вымушаны многія. І аб'ект гэты — грамадская вакзальная прыбіральня.


Фота Віталя ГІЛЯ

Надпісы папяраджваюць

Нядаўна ў рэдакцыю "ГС" пазваніла жанчына (прыехала ў госці да сваякоў) і сказала літаральна наступнае: "...А вы ведаеце, што ў вас самы дэмакратычны вакзал?". На маё пытанне: "Чаму?" — адказала: "Бо прыбіральня на вакзале бясплатная, а зайсці туды страшна — ужо за тры метры на падыходзе слёзы з вачэй сыплюцца...".

Удакладняць, якое паняцце ў слова "дэмакратычны" укладвае госця нашага горада, не хацелася. Але і параіць не заходзіць у вакзальную прыбіральню — не той выпадак.

Смуродам ад прыбіральні пасажыры на слонімскім вакзале дыхаюць ужо шмат гадоў. Зараз тэрыторыя вакзала рамантуецца, а пра туалет, быццам, зноў забыліся. А калі ў бюджэце 50-тысячнага горада столькі часу не знаходзіцца грошай, каб пабудаваць сучасную прыбіральню на вакзале, то якая ўжо тут дэмакратыя.

Мікола КАНАНОВІЧ

ВЯСКОЎЦЫ

ЦАРЫЦА З ВЁСКІ КАПУСТЫ

Жыве ў вёсцы Капусты, што недалёка ад Сурынкі (калгас імя Суворава), Вольга Антонаўна Нядбайлік. Жанчына цяжкага лёсу. Але што б мы пра яе ведалі, каб не дачка бабы Вольгі, якая патэлефанавала ў рэдакцыю і расказала аб сваёй маці шмат чаго цікавага.

Пра ўсё астатняе карэспандэнты "ГС" даведаліся на месцы, калі сустрэліся з Вольгай Антонаўнай. Знайсці яе было і складана, і адначасова проста. Запыталіся ў вяскоўцаў: "А дзе тут жыве Вольга Антонаўна Нядбайлік?"

— А можа ў яе якое іншае прозвішча? — запыталіся ў адказ.

— Ды не. Яе яшчэ "Царыцай" клічуць...

— Дык вось жа яна, па дарозе ідзе!

І сапраўды, па вёсцы ішла бабуля. Тут жа на вуліцы і паразмаўлялі з Вольгай-Царыцай. А высакародная гэта мянушка дасталася ёй яшчэ ад свёкра. Той пры цары-бацюхне ў войску служыў, у кавалерыі. Неяк вяртаўся на кані дадому і суседзям пахваліўся: вось, маўляў, цар на белым кані заўсёды ездзіць, і я, як той цар, таксама на белым кані.

Так і прыляпілася — цар ды цар, і на сына перайшло. А хто ж у цара жонка, як не царыца?

Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

Баба Вольга

Але не царскім атрымалася жыццё ў Вольгі Антонаўны Нядбайлік. Нават нараджэнне жанчыны прыпала на ліхі год — 1914. Ад вайны сям'я з'ехала ў Расію. На радзіму вярнуліся толькі праз сем гадоў, аж у 1923 годзе.

— Пры Польшчы, — расказвае Вольга Антонаўна, — давялося закончыць чатырохгодку. Далей вучыцца нас, беларусаў, не пускалі, таму займаліся гаспадаркай. Але толькі яе наладзілі, як зноў вайна.

У вайну Вольга-Царыца жыла на хутары, недалёка ад вёскі Падмошша. Удзень на полі працавала прыходзілася, а ноччу дапамагала партызанам — хлеб пякла. Але тыя партызаны, па словах вясковай жанчыны, розныя былі. Хто, сапраўды, з навалай нямецкай змагаўся, для тых нічога не было шкада. А бандыты са стрэльбай усё да ніткі забіралі, дык гэтых і партызанамі не назавеш.

Пасля вайны трэба было "падымаць" дзяцей. Іх у Вольгі Антонаўны было трое: сын ды дзве дачкі, старэйшая з якіх ужо памерла. А колькі ў бабулі Вольгі ўнукаў і праўнукаў, яна ўжо і пералічыць не можа.

Жыве сёння Вольга-Царыца на свае семдзесят тысяч рублёў пенсіі і нічога ўжо лепшага ад жыцця не чакае. Сама гаспадарку сваю вядзе, дапамогі не просіць. Старшыня калгаса гэтай восенню капалку прыслаў, каб бульбу дапагчы выкапаць, але ж адмовілася баба Вольга. Кажа, зрок дрэнны апошнім часам стаў, капалка пройдзе — не пазнаю, дзе бульбачка, дзе каменне. Па старой звычцы, з гачкаю ў напрацаваных руках, сама ўсю і выбрала.

— Бывайце, дзеткі. Няхай шчасцейка ды здароўе вам заўсёды спрыяюць у жыцці, — пажадала нам на развітанне царыца з Капустоў.

Валерый КАВАЛЕНКА

ПОШТА

НЕ ХВАЛЮЙЦЕСЯ, КРЭДЫТЫ ЁСЦЬ. І САМЫЯ РОЗНЫЯ

"Паважаная рэдакцыя "Газеты Слонімскай"!

Звяртаецца да вас 25-гадовая сланімчанка па вельмі хвалюючай мяне справе. Не так даўно я наведалася ў крэдытны аддзел мясцовага банка, дзе мне паведамілі, што маладым сем'ям крэдыты даюцца толькі на набыццё мэблі і тэхнікі для дома. А болей ніякіх няма.

Але праз некалькі дзён знаёмыя паведамілі, што купляюць кватэру, і ім далі крэдыт у далярах. А зусім нядаўна і сяброўка расказала, што яе брат атрымаў грошы ў крэдыт на пакупку кватэры.

Вельмі ж мне стала цікава, што гэта за крэдыты такія ў нас? Яны ўсім выдзяляюцца, ці толькі выбраным (сваякам ды знаёмым), ці па нейкай "асобай" чарзе?

Не маглі б вы растлумачыць пра гэтыя крэдыты падрабязней? Бо маладым сем'ям зараз вельмі нялёгка жывецца ў нашай краіне. І такая інфармацыя зацікавіць вельмі многіх.

З павагаю, Наталля."

Ад рэдакцыі:

Калі казаць аб льготных крэдытах, то ўжо ў 2004 годзе Нацбанк плануе спыніць эмісійнае крэдытаванне дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту, за кошт якога маладыя сем'і штогод набывалі жыллё на ільготных умовах. Аб гэтым заявіла галоўны эканаміст аддзела фінансавага і інвестыцыйнага аналізу дэпартаменту даследвання і статыстыкі Нацыянальнага банку Алена Маталыга. Калі пяць гадоў таму назад доля ільготных крэдытаў у фінансаванні жыллёвага будаўніцтва складала 39%, то на сённяшні дзень — усяго 14,7%.

А каб атрымаць ільготны крэдыт, трэба стаяць у чарзе на жыллё. Без розніцы, на прадпрыемстве, ці ў выканкаме. Рэсурсы на гэтыя крэдыты выдзяляюцца дзяржавай. Для гараджан, згодна з Указам прэзідэнта №185, умовы ільготнага крэдытавання — на 20 гадоў пад 10% гадавых, для вяскоўцаў — на 40 гадоў пад 5% гадавых.

Але сама працэдура атрымання ільготнага крэдыту даволі марудная. Як паведаміў кіраўнік Слонімскага аддзялення "Беларусбанка" Аляксандр Лагуцік, зараз ільготныя крэдыты атрымліваюць сем'і, якія стаялі на чарзе на атрыманне жылля з 1997 года. Ды і памеры крэдыту складаюць толькі 75% ад кошту кватэры.

Літаральна з сярэдзіны лета "Беларусбанк" дае крэдыты без уліку вострай патрэбнасці ў жыллі — усім працаздольным грамадзянам, якія жадаюць набыць дом ці кватэру з большай жыллёвай плошчай. Як адзначыў Аляксандр Лагуцік, крэдыт гэты выгадны тым, што выдаецца ў валюце, і сумы крэдыту адразу можа хапіць на набыццё, напрыклад, аднапакаёвай кватэры. Калі ўзяць 1000 даляраў, то пад 7-8% гадавых на шэсць гадоў у месяц прыйдзецца выплочваць недзе 18 даляраў.

Так што крэдыты на набыццё жылля ёсць. І не толькі на жыллё. Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць непасрэдна ў "Беларусбанку".

Валерый КАВАЛЕНКА

ОБРАЩАЙТЕСЬ К ДИРЕКТОРУ АВТОПАРКА №3

В "ГС" пришло письмо от жителей района Рыщицы, в котором они рассказали о своей проблеме.

Дело в том, что, как говорится в письме, людям из этого района очень неудобно добираться в центр города. 11-й маршрут автобуса с 9.00 до 14.00 находится на пересменке. Поэтому детям, проживающим в Рыщицах, нужно выходить в школу на 2-3 часа раньше, чтобы успеть на занятия во вторую смену.

"Дети все это время болтаются без дела по городу, — говорится в письме, — а теперь же так холодно".

"Можно ли как-то изменить график 11-го маршрута, — спрашивают жители Рыщиц у директора слонимского автопарка №3, — чтобы было удобно для всех?"

Корреспондент "ГС" попросила директора автопарка №3 Владимира Николаева прокомментировать эту ситуацию. Владимир Николаевич сказал, что жителям Рыщиц нужно обратиться к нему с письменной просьбой, указав то удобное время, когда детям нужно быть в школе. И уже после этого администрация автопарка рассмотрит вопрос об изменении графика движения автобуса 11-го маршрута.

Ольга ШИНКЕВИЧ

АРМИЯ

ЛУЧШИЕ ТАНКИСТЫ СЛУЖАТ В СЛОНИМЕ

В начале сентября на Обуз-Лесновском полигоне проходили состязания танковых экипажей сухопутных войск вооруженных сил Беларуси.

Как сообщил корреспонденту "ГС" заместитель командира 11 отдельной механизированной бригады по воспитательной работе полковник Матук, шесть экипажей из 6, 11, 120 механизированных бригад, 30 и 37 баз хранения вооружения и техники демонстрировали свои знания и умения в тактической, инженерной, технической, военно-медицинской, огневой подготовке. Соревновались танкисты и в вождении боевых машин, физической подготовке, подготовке по связи и защите от оружия массового поражения.

Подведение итогов состязаний вывело на первое место танковый экипаж 40-го отдельного танкового батальона 11-й механизированной бригады. В составе экипажа были командир танка уроженец Слонима старший лейтенант Павел Федосеев, наводчик рядовой Олег Базанов, призванный из Лиозненского района Витебской области, и механик-водитель ефрейтор Валерий Карнышов из Фаниполя Минской области.

Лучший танковый экипаж был награжден ценными призами — наручными часами. А танкисты-срочники, кроме того, были поощрены еще и краткосрочным отпуском на родину, что для них всего ценней.

Валерий КОВАЛЕНКО

МАСТЫ

ЯК ВЫМІРАЛІ, ТАК І ВЫМІРАЕМ

Як сведчыць паўгадавая статыстыка, і сёлета не змянілася дэмаграфічная сітуацыя ў раёне: смяротнасць болей як у два разы перавышае нараджальнасць.

За гэты час памерла 400 чалавек, а нарадзілася толькі 188. Калі ў горадзе смяротнасць не на шмат перавышае нараджальнасць (126 памерла і 97 нарадзілася), то ў раёне гэтая лічба мае суадносіны тры да аднаго (274 і 91). Натуральны спад насельніцтва за гэты час склаў 212 чалавек і, у параўнані з гэткім перыядам мінулага года, павялічыўся на 24%.

ДАРАГАЯ БУЛЬБА

Вяскоўцы працягваюць збіраць другі ўраджай — капаюць бульбу.

Для многіх людзей яна становіцца надта дарагая, калі ўлічваць, што ўраджай сёлета не ўсюды багаты. Не ўсе людзі маюць тэхніку і таму вымушаны арэндаваць яе. У сярэднім за адну сотку разаранага бульбянога палетка ў раёне бяруць адну тысячу рублёў. Многія людзі, асабліва пенсіянеры, не могуць заплаціць грошы, калі, напрыклад, маюць 30 сотак.

У ЛАЗНІ БУДЗЕ ГАСПАДАР

Лазня ААТ "Мастоўдрэў", якая была зачынена два месяцы назад з-за нерэнтабельнасці, у хуткім часе набудзе новага гаспадара.

Ім стане мясцовы прадпрымальнік Ш.

ТАНЦЫ НА АСФАЛЬЦЕ

Моладзь любіць адпачываць: танцаваць ды весяліцца.

Іншы раз гэта набывае дзіўныя формы. Асабліва гэта адчувальна ў вёсцы Правыя Масты, дзе сельскі клуб размешчаны побач з аўтамагістраллю. Падчас правядзення дыскатэкі большая частка моладзі "тусуецца" прама на дарозе, і праязжаючыя машыны вымушаны падоўгу спыняцца, каб не наехаць на публіку.

УЗНЯЛІ ПОМНІК

Жыхары вёсак Правыя і Левыя Масты ўзнялі помнік, пастаўлены на левым беразе Нёмана ў гонар загінуўшых салдатаў Гродзенскай добраахвотнай дывізіі імя Стэфана Баторыя, якія ў ліпені 1920 года супрацьстаялі тут наступаючым войскам Чырвонай арміі.

Тады страты з абодвух бакоў былі значныя. Помнік паставілі ў канцы дваццатых гадоў. Ён быў разбураны немцамі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Камень быў скінуты з пастамента і з гадамі заплыў зямлёй і глеем. Пастамент захаваўся ў нармальным стане і знаходзіцца на зямельным ўчастку Уладзіміра Рыбака. Ініцыятарам гэтае акцыі выступіў Іван Трухан. Ён разам з гаспадаром і некалькімі сябрамі вярнулі камень на месца, але да поўнай рэстаўрацыі помніка яшчэ далёка.

САРАКАПЯЦІГАДОВАЯ ГАРАНТЫЯ

У Мастах хуткімі тэмпамі ідзе замена трубаў цеплацэнтралі ў мікрараёне па вуліцы Будаўнікоў і праспекце Юнацтва.

Магчыма, работы будуць закончаны да пачатку ацяпляльнага сезона. Паколькі, як сцвярджаюць рабочыя, новыя трубы разлічаны на саракапяцігадовы тэрмін эксплуатацыі, то праблемы з забеспячэннем насельніцтва гарачай вадой у будучым не будуць стаяць так востра.

Антон МАКЕЙ

НАША МОВА

БЯЗМОЎНАЯ БЕЛАРУСЬ

Фота Віталя ГІЛЯ

Беларусь – прыгожы і самабытны край, які знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Таму ён заўсёды прывабліваў да сябе чужынцаў. Яны імкнуліся далучыць яго не толькі ваеннымі захопамі, але і дыпламатычнымі хітрыкамі, а таксама шляхам асіміляцыі, так званай моўнай акупацыяй.

Дзеля гэтага спачатку ў Рэчы Паспалітай, а потым і ў царскай Расіі мова карэннага насельніцтва Беларусі афіцыйна была забаронена, разбуралася, знішчалася, беларусаў рабілі палякамі і рускімі. Гэтаму, на жаль, садзейнічалі касцёл і царква. У выніку Беларусь станавілася эканамічным і культурным донарам для суседніх краін. Успомнім польскага паэта Адама Міцкевіча і рускага пісьменніка Фёдара Дастаеўскага, карані якіх — на беларускай зямлі.

У 90-я гады, калі Беларусь стала самастойнай дзяржавай, назіраўся сапраўдны ўздым, росквіт беларускай мовы. Яна набыла статус дзяржаўнай, незвычайна хутка пашыралася ў школах, дзіцячых садках. У той час мы разам з Мікалаем Іванавічам Ракевічам — сапраўдным сябрам Адраджэння — не раз і не два выступалі перад бацькамі школьнікаў Слоніма, агітавалі за тое, каб іхнія дзеці пазнавалі свет і навуку, вучыліся на беларускай мове. Памятаю, з якой цікавасцю, увагай слухалі яны нас. Недарэчных пытанняў "а чаму?" не задавалі. Іх толькі палохала адно: ці не з'явіцца беларусізацыя, як гэта ўжо было ў 20-я гады 20 стагоддзя, нейкай часовай кампаніяй? Нават рускія па нацыянальнасці пагаджаліся, што тут, у Беларусі, іхнія дзеці павінны вучыцца не на польскай і не на рускай, а менавіта на беларускай мове. Калі не памыляюся, ва ўсіх школах Слоніма, акрамя пятай, быў адкрыты шэраг беларускамоўных класаў. Вельмі сур'ёзна ўзяліся за гэтую справу ў чацвёртай сярэдняй школе, дзе дырэктарам працаваў Яфімчык Уладзімір Фёдаравіч. Як грыбы пасля жжджу, раслі, з'яўляліся беларускамоўныя групы ў дзіцячых садках. Усё ішло да таго, што пераважная большасць школ і садкоў стануць беларускамоўнымі. Бацькі шчыра віталі беларусізацыю, яны радаваліся таму, што іхнія дзеці вяртаюцца да сваіх вытокаў. Прыходзіцца адзначаць, што падобную падтрымку мы не заўсёды знаходзілі сярод настаўнікаў, здавалася б, найбольш перадавой, найбольш культурнай часткі нашага грамадства. Як відаць, многія з іх звыкліся з рускамоўным асяроддзем і страшыліся пераходзіць у іншае, беларускамоўнае. Пасля ганебнага для свядомых беларусаў рэферэндуму (1996 год) і прэзідэнцкага ўказа пра дапаўненні ў "Закон аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" (1998 год) іхнімі рукамі чыноўнікі рознага рангу сталі знішчаць беларускамоўнае навучанне і выхаванне ў школах і садках, што ў нашым горадзе неўзабаве пасняхова было здзейснена.

> ... Сёння стан з беларускай мовай на Беларусі перажывае ці не самыя горшыя, самыя змрочныя часы, ён катастрафічны. Вясковыя беларускія жанчыны — носьбіты народнай мовы – адыходзяць у нябыт, а ўвесь беларускі люд ахапіла трасянка...

Сёння стан з беларускай мовай на Беларусі перажывае ці не самыя горшыя, самыя змрочныя часы, ён катастрафічны. Вясковыя беларускія жанчыны — носьбіты народнай мовы — адыходзяць у нябыт, а ўвесь беларускі люд ахапіла трасянка, якая, калі так можна сказаць, стала адной з дзяржаўных моў. На ёй размаўляе не толькі пераважная большасць прэзідэнцкай вертыкалі, яе можна пачуць у парламенце, на вуліцы, на тэлебачанні, у судзе і г. д.

Цяперашняя трасянка адрознівацца ад ранейшай, савецкай. Калі аснову савецкай трасянкі складалі беларускія словы, да якіх дабаўляліся рускія з выразным беларускім вымаўленнем, дык за гэты час яна стала амаль поўнасцю рускай, перамешанай асобнымі беларускімі словамі і з характэрным беларускім вымаўленнем. Што ж, мы маем няшчасце назіраць поўную русіфікацыю талерантнага беларускага народа, які паступова страчвае такі важны інстынкт як інстынкт самазахавання.

Цяжка жыць у бязмоўнай дзяржаве, дзе хлусня называецца праўдай, а праўда хлуснёй, дзе співаюцца не толькі мужчыны, але і жанчыны, падлеткі, дзе закон як дышла: куды павярнуў, туды і выйшла.

Не так даўно прыйшлося прысутнічаць у раённым доме культуры на адкрыцці свята ў гонар 750-годдзя Слоніма. Непрыемна ўразіла, што запрашэнне на свята мне, беларускаму літаратару, прыслалі на рускай мове. Потым дзве гадзіны слухаў, як нашы гарадскія і прыезджыя кіраўнікі раздавалі віншаванні гораду на трасянцы. Ці хацеў дажыць да гэтага мой старажытны Слонім — Слонім Льва Сапегі, Міхала Агінскага, Міхала Валовіча, Іосіфа Стаброўскага, Анатоля Іверса?

Хлопцы, вясковыя хлопцы! Не сціскайце сваю душу ў гармонік, успомніце цёплы вясновы вечар, калі пахне бэз і кружыць галаву, успомніце туман, што паволі плыве над балотам, успомніце маці, якая кліча вас у хату. Успомніце і падтрымайце маці Беларусь, не дайце ёй загінуць у халодных сутарэннях небыцця.

Тым не менш, у Слоніме ёсць людзі, якія думаюць і разважаюць па-сучаснаму. Яны падтрымлівалі і стараюцца падтрымаць намаганні слонімцаў, накіраваныя на Адраджэнне. Гэта і былы дырэктар нафтабазы Міхась Салавей, і цяперашні яе кіраўнік Пётр Турок, дырэктар вінаробчага завода Міхаіл Акулік, дырэктар мясакамбіната Алег Бярдула, прадпрымальнікі Раман Гіль, Генадзь Бабошкін, Раман Мамедаў, Уладзімір Янушэвіч і іншыя. У свой час нямала зрабіў для адраджэння даўніх святаў, традыцый, самабытнай культуры Анатоль Цярэнін. Усе вышэй названыя слонімцы па сваму характару і тэмпераменту, напэўна, розныя, але ўсіх іх аб'яднала неабыякавасць.

Нас ратуе і тое, што беларуская зямля з яе незвычайнай прыродай, цудоўнымі, мяккімі краявідамі нараджае народ-лірнік, з якога бесперапынна вылучаюцца людзі-творцы з глыбокім пачуццём адданасці свайму роднаму куту, з нацыянальнай душой і сэрцам, цесна прывязанымі да родных каранёў. Верыцца: нягледзячы на цяжкасці, нацыянальна свядомая частка насельніцтва пранясе беларускую мову праз палітычныя буры аб'яднанняў, камуністычную настальгію і глабалізацыю, нармалізуе ў краіне моўнае жыццё, каб нашы нашчадкі былі ўдзячны нам за тое, што мы не далі згінуць беларускай мове, а разам з ёю дзяржаве і ўсёй беларускай нацыі.

Аляксей ЯКІМОВІЧ, член Саюза беларускіх пісьменнікаў

ОБЩЕСТВО

РАЗРЕШЕНА ОХОТА НА ПЕРНАТУЮ ДИЧЬ

С 21 сентября в Гродненской области официально открыта летне-осенняя охота на пернатую дичь.

Как отмечается в сообщении отдела информации Минприроды, в регионе выпало достаточное количество осадков и снизилась пожароопасная ситуация в лесах и на торфяниках.

БелаПАН

ВОЛКОВЫСК

ПОМЕНЯЛИСЬ РУКОВОДИТЕЛИ

Начальником коммунального унитарного предприятия "Управление капитального строительства Волковысского райисполкома" назначен Юрий Дылюк.

Начальником управления по труду и социальной защите райисполкома назначен Чеслав Станкевич.

ВЫЯСНИЛИ ОТНОШЕНИЯ

В реанимационное отделение Волковысского ТМО была доставлена 54-летняя жительница г.п.Рось Людмила Ю. с диагнозом резаная рана грудной клетки.

Как выяснилось, телесные повреждения ей причинил 66-летний Иван С. в ходе ссоры, которая возникла между ними в парке после распития спиртных напитков.

Возбуждено уголовное дело.

"НАШ ЧАС" С НОВЫМ РЕДАКТОРОМ

Редактором Волковысской районной газеты "Наш час" назначена Валентина Курилик.

До этого Валентина Курилик работала заместителем редактора районки, затем — заместителем председателя райисполкома, начальником управления по труду и социальной защите.

Александр ДАНИЛИН

ДЗЯТЛАВА

ЗНІКЛІ ВАГОНКА І ЦЭГЛА

З будаўнічай пляцоўкі калгаса "Слава працы" Дзятлаўскага раёна ўкрадзена вагонка і абразны брус.

Міліцыя хутка выйшла на след злодзея. Ім аказаўся мясцовы жыхар.

УКРАЎ І ПРЫЗНАЎСЯ

У дом да дзятлаўчаніна М. залез злодзей і ўкраў каляровы тэлевізар "Гарызонт" і грошы ў суме 1 мільён 800 тысяч рублёў.

На другі дзень ён з'явіўся ў міліцыю з павіннай. Вінаватым аказаўся мясцовы жыхар.

АПОШНЯЯ РЫБАЛКА СЛОНІМЦА

У вёсцы Дукрава на мясцовым возеры знойдзены труп 25-гадовага жыхара Слоніма Ш.

Ён прыехаў на рыбалку і памёр.

ПАВЕСІЎСЯ Ў СВАЁЙ КВАТЭРЫ

Пакончыў з жыццём 42-гадовы жыхар Дзятлава Н. Ён павесіўся ў сваёй кватэры.

Прычыны самагубства невядомы.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

СКАНДАЛ

ПРИНУДИТЕЛЬНОЕ ПРУССКОЕ ПРОИСХОЖДЕНИЕ,

или История о том, как родственники высокопоставленного гродненского чиновника чуть не получили от фонда "Взаимопонимание и примирение" 12 300 дойчмарок

От уважаемого в Гродно человека такого не ожидал никто. Иначе Антону Змитрукевичу просто не доверили бы ответственную и скрупулезную работу по оформлению документов, на основании которых лица, пострадавшие от фашистов в годы войны, или их наследники получают право на денежную компенсацию из республиканского фонда "Взаимопонимание и примирение" и немецкого фонда "Память, ответственность и будущее".

Справедливости ради надо отметить, что работавший на общественных началах секретарем квалификационной комиссии при Гродненском облисполкоме заведующий отделом по архивам и делопроизводству облисполкома Антон Змитрукевич в регионе наладил дело по сбору и обработке документов бывших остарбайтеров довольно хорошо. Задача была выполнена в сроки. В Гродно до мельчайших подробностей было продумано все: даже организация выплаты дойчмарок в банках — гражданам, среди которых большинство старики, выделялась охрана для того, чтобы большие, по белорусским меркам, деньги не отобрали грабители. Наверное, ощущение того, что все идет как по маслу, что на всех уровнях хвалят и верят, в один день толкнуло служащего на грех.

Условия, по которым могли выплачиваться деньги, были не слишком жесткими. Немцы согласились войти в положение тех, у кого не сохранились документы, и региональным комиссиям разрешалось прилагать вместо них письменные воспоминания либо газетные публикации. Достоверны ли они — дело совести. Но даже доверяя, представители немецких фондов оставляли за собой право выборочного контроля, сужая тем самым поле для возможных злоупотреблений. А они, как показала жизнь, имели место.

Будучи во всех деталях осведомленным в процедуре рассмотрения документов, связанных с выплатами, и имея гербовую печать "Аддзел па архівах і справаводству Гродзенскага аблвыканкома", 14 декабря 2001 года Антон Змитрукевич изготовил три фиктивные копии архивной справки N Г-824, якобы выданной управлением КГБ по Гродненской области, о насильственном вывозе в Восточную Пруссию и нахождении там на принудительных работах своих родителей — Антона Антоновича и Ольги Ивановны Змитрукевич. Справка свидетельствовала также о том, что там же, в Восточной Пруссии, родились его старшие братья Михаил и Евгений. "Липовый" документ он заверил своей подписью и имевшейся у него печатью. Все это стало основанием для того, чтобы два брата, якобы родившиеся в Пруссии, и сестра как наследница матери, умершей после создания фонда "Память, ответственность и будущее", получили в общей сложности 12 300 дойчмарок. Документы в отношении одного брата и сестры уже прошли весь районно-областной путь и были направлены в Белорусский республиканский фонд "Взаимопонимание и примирение" для рассмотрения. Дело оставалось за еще одним родственником — Евгением, проживающим в Осиповичском районе. Но там отдел социальной защиты райисполкома и ЗАГС не нашли оснований для внесения актовых изменений в свидетельство о рождении и не "поменяли" деревню Ярчаки Мостовского района на Восточную Пруссию.

Факт подделки документов выявился довольно скоро. И вскрыло его УКГБ по Гродненской области, которое и вело по данному факту следствие. Свидетели, проживающие в Ярчаках, подтвердили, что Антон Антонович и Ольга Ивановна Змитрукевич не вывозились на принудительные работы. А их дети — Михаил и Евгений — родились в Мостовском районе.

Недавно уголовное дело было рассмотрено в суде Ленинского района г.Гродно, который согласился с квалификацией преступления по ст.14 и ч.3 ст.210 УК РБ и, признав Антона Змитрукевича виновным в покушении на хищение имущества, вынес приговор: лишение свободы на 6 лет с отбыванием в колонии строгого режима. Ответчику назначена конфискация имущества и вменено лишение права занимать руководящие должности в госаппарате в течение 5 лет. Считая этот вердикт суровым, Антон Змитрукевич, взятый под стражу в зале суда, обжаловал приговор в вышестоящей инстанции. Хотя, чисто по-человечески, 6 лет за неполученные деньги — конечно же, много. К тому же к ответственности привлечен человек, не планировавший извлечь выгоду лично для себя. Он так и сказал в суде, что просто хотел помочь братьям и сестре.

Елена БЕРЕСНЕВА, "Р"

У АБ'ЕКТЫВЕ

ДЗЯТЛАВА І ДЗЯТЛАЎЧАНЕ

■ Алена Вайтушка ў мінулым годзе завочна закончыла Мінскі ўніверсітэт культуры. Цяпер яна працуе галоўным бібліёграфам Дзятлаўскай раённай бібліятэкі.



■ Жыхар Чырвонаармейскай вуліцы Аляксандр Шкуль убірае бульбу на сваёй сядзібе.

МАСТЫ

ЦАРКВА АДСВЯТКАВАЛА ЮБІЛЕЙ

Свята-Раства-Багародзіцкая царква ў вёсцы Гудзевічы Мастоўскага раёна адзначыла

тэктуры рэтраспектыўнарускага стылю. Як сцвярджае энцыклапедычны даведнік "Праваслаўныя храмы на

СЛОНИМ

СТАВКИ РАСТУТ

Введены новые ставки сборов за услуги, оказываемые Госавтоинспекцией Министерства внутренних дел нашей респуб-

СМИ

КОДЕКС МОЛЧАНИЯ

Общественный долг прессы заключается в том, чтобы придираться к власти при каждом удобном случае. Для нашего уха этот принцип звучит непривычно и жестко. Но, будучи сформулированным давно и не в Беларуси, он доказал свою правильность на практике.

Судья требует покинуть помещение перед началом судебного заседания по делу газеты "Рабочий"

Когда президента Соединенных Штатов Америки средства массовой информации, образно говоря, возили физиономией по столу за интрижку с практиканткой, он далеко не сразу признал свою вину. Но угрожать газетам и журналистам судом руководитель сверхдержавы себе не позволил. Хотя изгалялись над ним за мелкую, в сущности, шалость в таких формах и выражениях, каковые нашим чиновникам не являлись в самых страшных снах. Попробуем пояснить, почему сильные политики не берут прессу за грудки, шипя при этом в лицо: "За все ответишь!"

Основными слагаемыми успеха в современном мире являются рыночная экономика и демократия, неотъемлемой частью которой является свобода печати. Здоровой власти не страшны критика и нападки журналистов. Напротив, она использует СМИ в качестве контрольно-корректировочного механизма или попросту взгляда со стороны, позволяющего заметить вещи, порой скрытые от собственных глаз. При этом зерна следует отделять от плевел: разумные замечания принимать к сведению, а всякого рода глупости игнорировать.

— Анджэй Цеханавецкі — мастацтвазнавец, нашчадак старажытнага роду князёў Мсціслаўскіх і Заслаўскіх — добра вядомы ў Беларусі сваёй грамадска-дабрачыннай і мецэнацкай дзейнасцю. Яшчэ ў 50-я гады ён праявіў цікавасць да зямлі сваіх продкаў, род якіх у 15 стагоддзі перасяліўся ў Беларусь і шмат зрабіў для яе эканамічнага і культурнага развіцця. Бацька Анджэя, Ежы Цеханавецкі, быў дыпламатам царскай Расіі, а затым і Рэчы Паспалітай. У час Першай сусветнай вайны ён пераехаў з фальварка Бачэйкава (Віцебшчына) у Варшаву, дзе ў 1924 годзе і нарадзіўся Анджэй. Сваё дзяцінства сын дыпламата правёў у Будапешце. У вайну ўдзельнічаў у Варшаўскім паўстанні, а затым вывучаў гісторыю мастацтва ў Ягеленскім універсітэце. У Цюбінскім універсітэце (Германія) абараніў доктарскую дысертацыю пра тэатр Агінскага ў Слоніме, на аснове якой і была выпушчана гэтая кніга. У 1981 годзе ён упершыню наведаў Беларусь. Аб'ехаўшы мясціны, звязаныя з жыццём і дзейнасцю сваіх продкаў, спадар Цеханавецкі быў моцна ўражаны, калі ўбачыў жудасную карціну запусцення, калі былыя фальваркі, культавыя і архітэктурныя помнікі ператварыліся ў стадолы і фермы, а велічныя паркі і маёнткі зараслі дзікай травой. Гэта выклікала тады ў яго не толькі абурэнне, але і прыток сіл, энергіі для актыўнага ўдзелу ў працэсе адраджэння Беларусі. Менавіта дзякуючы яму былі вернуты старажытны слуцкі пояс, рэдкае гродзенскае выданне 18 стагоддзя, малюнак Нясвіжа 19 стагоддзя і іншыя каштоўнасці. Акрамя таго, Анджэй Цеханавецкі з'яўляецца ініцыятарам і фундатарам многіх міжнародных навуковых сустрэч па праблемах мінуўшчыны Беларусі.

— Чаму, менавіта, на вашу долю выпала перакладаць кнігу Цеханавецкага "Міхал Казімір Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме"?

— У час адной са сваіх паездак Анджэй Цеханавецкі зрабіў захады аб перакладзе яго кнігі на беларускую мову. І так атрымалася, што перакладчыкам стаў я. Пэўна, не апошнюю ролю адыграла і тое, што Слонімшчына — мая радзіма. Адклаўшы многія важныя справы, я пераклаў манаграфію пра тэатр Агінскага ў Слоніме на родную мову, і яна ў 1993 годзе выйшла з друку. Сёння кніга Цеханавецкага патрабуе перавыдання, таму што многія яе нават і не бачылі, а хацелі б мець у асабістай бібліятэцы.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПОЧТА

Я «ПРОВИНИЛАСЬ»

Живу я в многоквартирном доме на улице Тополёвой в Слониме. Случилось так, что я «провинилась» перед Энергосбытом, просрочила платежи. Заплатила за электроэнергию позже установленного срока 17.08.02., а 23.08.02. подачу электроэнергии отключили. Хотя прошло достаточно времени, чтобы увидеть поступление платежа. Это недоразумение было бы быстро разрешено, окажись я дома. Однако я была в отъезде. Приехала только 01.09.02. Все продукты в морозильнике испортились. Но это ещё не всё — в двери всё это время торчали квитанции. Думаю, только счастливая случайность спасла мою квартиру от воров.

Неужели, если человек по каким-то своим личным причинам вовремя не заплатил маленькую сумму, то тем самым нанёс вред такой солидной фирме, как Энергосбыт? И ведь никого из этой организации не заинтересовало, почему человек длительное время не обращался по поводу подключения?

В условиях, когда зарплата не платится вовремя, когда люди в отпусках и разъездах, может следует пересмотреть инструкции об оплате той же электроэнергии.

Хотелось бы, чтобы на уровне исполкома были скоординированы сроки всех платежей. Ведь людям приходится по 3 – 4 раза ходить в банк, чтобы в срок угодить всем организациям, услугами которых они пользуются. Этим самым была бы исключена возможность попасть в немилость к кому-либо.

Н.К.

ПАДЗЯКА З ЗЭЛЬВЫ

Цяжкі сённяшні час не дазваляе мець дастаткова бюджэтных сродкаў для стварэння неабходных умоў навучання, выхавання і аздараўлення нашых вучняў. Але і ў гэты нялёгкі перыяд ёсць калектывы, якія заслугоўваюць вялікай падзякі за дапамогу педагогам, школам і вучням. Да такіх прадпрыемстваў адносіцца і калектыў Слонімскага кардонна-папяровага завода "Альбярцін" у асобе генеральнага дырэктара Саліты Пятра Андрэевіча і старшыні назіральнага савета Румянцава Аляксандра Васільевіча, якія аказалі нашай школе-інтэрнату матэрыяльную дапамогу ў падрыхтоўцы да новага навучальнага года.

Нас вельмі ўразілі іх дабрыня, чуласць, разуменне нашага становішча. І хоць не так лёгка сёння жывецца іх калектывам, але, тым не менш, яны выдзелілі пэўныя матэрыялы, так неабходныя для рамонту школы.

Адміністрацыя Зэльвенскай санаторнай школы-інтэрната

ПОШТА

САБАЧЫ "ХІП-ПАРАД" У ГОРАДЗЕ

Горад яшчэ знаходзіўся ў святочнай аўры пасля святкавання юбілею. Рэдкія прахожыя ішлі без прывычнай спешкі, адчуваючы эстэтычную асалоду ад рукатворнай прыгажосці. І раптам перад вачамі прахожых паўстала нечаканае дзейства: з боку Савецкай вуліцы ў напрамку да пастамента танка неслася сабачая зграя.

Фота Віталя ГІЛЯ

Такое суправаджэнне можа аказацца небяспечным

Уперадзе, за "галоўнакамандуючага" быў гладкашэрсны фокстэр'ер, за ім беглі вогненна-рыжая колі, н'юфаўндленд, сэтэр, баксёр. Завяршала "шэсце" брудна-белая балонка з калючкамі дзядоўніку на калматай поўсці і хвосціку.

Гэтыя прадстаўнікі сабачай эліты знаці калісьці ў сваім жыцці лепшыя часы. І былі, відаць, гонарам сваіх гаспадароў. А цяпер яны худыя, занядбаныя, з сумнымі вачыма бадзягі, бяздомныя жывёлы-бамжы, папрашайкі каля мясных радоў на рынку. Дык што прымусіла гаспадароў выкінуць на вуліцу сваіх чатырохногіх сяброў? Магчыма, хваробы, а можа проста абрыдла прыбіраць за імі і вадзіць на прагулкі.

Але вернемся да нашай зграі. Мірны сабачы алюр раптам, абагнуўшы пастамент, перайшоў на галоп. І пачаўся такі адчайны брэх, рык, скуголенне, што зрабілася вусцішна. Дасціпны прахожы выдаў характарыстыку: "Узнік этнічны канфлікт". І бордзенька пашыбаваў прочкі ад сабачых разборак. Бо яшчэ ўкусяць, а курс лячэння ад шаленства балючы і доўгі.

Дык дзе разумны выхад з гэтай праблемы? Калі мы лічым сябе цывілізаваным грамадствам, то апеку над бяздомнымі жывёламі патрэбна браць на сябе. На маю думку, у горадзе павінна быць створана асацыяцыя па абароне бяздомных жывёл. І гарадскім уладам патрэбна стварыць прыёмнік і адпаведную ветэрынарную службу, дзе лячылі б і стэрылізавалі хворых жывёл. А кармы можна атрымліваць са школьных сталовак — тыя рэшткі абеду, што не з'ядаюць школьнікі. І, магчыма, нехта забраў бы з такога прыёмніка сабе на выхаванне чатырохногага сябра. Словам, патрэбна зрабіць так, як гэта ўжо зроблена ў Мінску і Гродне. Гэта мае асабістае меркаванне. Магчыма, у некага ёсць на гэты конт іншыя думкі.

Леаніда ЦАПКО, жыхарка Слоніма

Газета Слонімская
26 верасня — 2 кастрычніка 2002г. №39 (277)

ГУМАРЭСКА

АД МАКРЫЦЫ да граніцы

Прадпрымальнікі Міхась Куляба і Сяргей Камізэльскі ехалі ў Польшчу за таварам. Вецер, што ўрываўся ў акно іхняга буса, быў цёплы і пяшчотны, нібы пацалунак дзяўчыны. Горад застаўся далёка ззаду. Машына кацілася з узгорка ў даліну па гарачай, як патэльня, асфальтаванай шашы.

— Неўзабаве будзе мая родная вёска Макрыца! — прамовіў Камізэльскі з такой узнёсласцю, нібы яны пад'язджалі да Венецыі.

— Тармазі! — раптам крыкнуў ён сябруку, бо пад колы буса ледзь не трапіў п'яны дзед, што нейкім цудам ехаў на ровары. Пад незадаволены піск тармазоў машына спынілася.

— О, дык гэта ж дзед Цімох! — пазнаў земляка Камізэльскі. — Я яго цвярозым бачыў толькі на пасляваенным здымку. Давай падкінем да Макрыцы, а то яшчэ хто падаб'е небараку.

Яны адчынілі бус, паклалі туды ровар, а побач прымастакавалі Цімоха Дубялеўскага, і той, прыняўшы гарызантальнае становішча, задаволена засоп носам.

Не паспелі як след набраць скорасць, зноў прыйшлося спыніцца: зноў сустрэлі знаёмага, што ўжо ехаў з Польшчы. Пагаманілі на тэму: што выгадней купіць, каб яшчэ выгадней прадаць. А калі развіталіся, Куляба націснуў на газ. Ды неўзабаве павінен быў затармазіць: міліцыянер загадаў. Ён папрасіў у Кулябы правы і доўга ўглядаўся ў іх, як сарока ў костку, нібыта ніколі правоў не бачыў. Потым прычапіўся, што пярэднія колы лысыя... Словам, сапсаваў хлопцам настрой. І ніякага дзіва няма ў тым, што, толькі пад'ехаўшы да граніцы, яны ўспомнілі пра дзеда Цімоха. Адчынілі бус і ўбачылі, што ён паранейшаму спіць у абдымку з роварам. Асцярожненька вынеслі дзеда і паклалі ў прыдарожную канаву, а потым побач паклалі ровар.

Малюнак Яўгена ІВАНОВА

У Польшчы прабылі амаль тыдзень. Нават і не ў самой Польшчы, а на граніцы, бо ўблыталіся ў адну непрыемную гісторыю. Потым пакуль збылі тавар, пакуль тое ды сёе, праз дзеда Цімоха забыліся ўшчэнт. А як успомнілі, то ажно заныла ў пятах: часам змарнаваўся чалавек. Гэта ж п'янага завалаклі да саменькай граніцы і пакінулі ў канаве. Тут кожны заперажывае, у каго сумленне ёсць. Вось і вырашылі Куляба з Камізэльскім з'ездзіць у Макрыцу і асцярожненька выведаць, што там і як. А ў каго ж ты лепш выпытаеш пра мужа, як не ў жонкі?

Калі яны прыехалі ў вёску, баба Казя якраз выбірала з градаў агуркі.

— Глянь, яна не ў чорнай хустцы, а ў белай. Значыць, жывы Цімох, — выказаў здагадку Сяргей Камізэльскі. — І паводзіць сябе спакойна, не хвалюецца нябыта, звычайнай справай займаецца.

— Што ты тут варожыш. Давай канкрэтна пытаць.

— Баба Казя! — перахіліўшыся праз вароты, гукнуў худы і загарэлы, нібы каштан, Камізэльскі. Міхась Куляба, тоўсценькі і моцны, як маладзенькі баравічок, таксама выйшаў з машыны.

— Га! — борздзенька абазвалася бабка.

— А дзе ж ваш дзед?

— Косіць. За выганам дзялку атавы маем, вось ён з раніцы і пайшоў туды. А што такое?

— Ды нічога. Проста цікавімся, як жывяце.

— Ой, добра жывём, сыночкі, — задаволена прамовіла бабка. — Праўда, гэтае добра было не заўсёды. Піў надта ж мой Цімох. Цягнуў гарэлку, як цэмент ваду. І, мае ж вы дзеткі, нядаўна дапіўся да белай гарачкі. Ды ў той гарачцы за адзін дзень на ровары дапёр ажно да польскай граніцы. Во што гэта зараза з людзьмі робіць! Туды пёр без памяці. Ачомаўся толькі ў прыдарожнай канаве. Ды сам можа і не дайшоў бы да розуму, але людзі дапамаглі. Яны і сказалі Цімоху, што гэта канава пры польскай граніцы, а не ля нашай Макрыцы. То Цімох як сеў на ровар! Пяць сутак дамоў пілаваў. Казаў, што паспіць дзе-небудзь пад кустом, як заяц, бо боязна было, каб ровар не сцібнулі, ды зноў у дарогу. Меў дзесяць тысяч рублёў у кішэні, што яшчэ не паспеў прапіць, то харчаваўся ў прыдарожных сталоўках. А так усё ехаў і ехаў. І такое ж было мне дзіва, калі ён прывалокся дадому стомлены, худы і... цвярозы. З таго часу, мае ж вы дзеткі, гарэлкі і ў рот не бярэ. Во, які стаў пасля белай гарачкі! Баіцца, што як зноў нажлукціцца, то можа і Польшчу пераехаць, аж да Германіі даперці.

— Так..., — задаволена прамовіў Камізэльскі. Не было б, кажаце, шчасця, ды няшчасце памагло.

— Во-во, галубок. Акурат усё так, — задаволена прамовіла баба Казя і зноў узялася выбіраць з грады зялёныя і пузаценькія, як французскія лягушкі, агуркі.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ПОЭЗИЯ

Николай ГРИГОРЬЕВ

***

С водой у нас сплошная лажа,
Её не то что, как бы пить,
Ею дермо, простите, даже
За падло в унитазе смыть.

***

Хоть в стенку бейся головой,
Не будет в этом толку.
Уж если туп начальник твой,
Терпи — это надолго.

***

Сижу в тоске, гляжу в окно,
А там дождливо и темно,
Пейзажик мерзкий, что сказать?
Осталось выпить и лечь спать.

***

Он умный был, как Ломоносов,
Ума палата, знаний тьма...
Но костью в горле был у босса —
Вот вам и горе от ума.

ДЗІЦЯЧЫЯ ВЕРШЫ ПРА СЛОНІМ

Маленькі Парыж

Маленькі Парыж!
Ты на Шчары стаіш.
Мясціны зямлі
У кроплях расы.
Мой Слонім завеяй
Пяшчотнаю вее,
А сонца устане,
Ён міла так гляне.
Маленькі Парыж!
Ты на Шчары стаіш.

Паша САШКО, СШ №10

Слонімскія падарункі

Слонім —
правінцыйны гарадок.
Маленькі, але мілы.
Ён шчыра дорыць спакой
І радасці хвіліны.
Спакой за дзетак нашых,
За бацькоў,
Спакой жыцця
За ўсіх, хто побач з намі.
Усмешкі ўсім, хто пажадае,
Падорыць кожны сланімчанін.
Каб у памяці ва ўсіх застаўся
Сардэчны і гасцінны горад.
Хвіліны радасці,
натхнення і красы
Заўсёды будуць разам з намі,
І вам падорым іх, сябры,
Каб нас не забывалі.

Таццяна ГАРЭЛАВА, СШ №8, 9кл.

Родныя краявіды

Я вельмі люблю
адпачыць каля рэчкі,
Дзе побач, на лузе,
пасуцца авечкі.
Па небе ляцяць
журавы чарадой,
У чароце рыбак
задрамаў над вадой.

Люблю краявідамі
я захапляцца.
Пачуцці такія,
што цяжка стрымацца.
Узгоркі, раўніны, лясы і палі...
Няма даражэй
маёй любай зямлі.

Дзмітрый ЛЕБЯДЗЕЎ, гімназія №1

Мой любы горад

Мой любы горад Слонім!
Твае лугі, азёры
Блішчаць пры свеце зорак.
Я знаю многа гарадоў:
І Рэчыцу, і Гродна,
Ды Слонім — даражэй!
І ён мне самы родны.
У гэтым годзе Слонім
Святкуе юбілей.

Людміла УРБАНОВІЧ, СШ №7, 3кл.

АПАВЯДАННЕ

ВОЖЫКАВА ШКУРА

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксей Якімовіч сумесна з упраўленнем адукацыі Слонімскага райвыканкама праводзіць конкурс малюнкаў да сваёй кнігі "Рыжык. Апавяданні і казкі", якая будзе выдадзена сёлета ў Слонімскай друкарні.

Пераможцы конкурсу атрымаюць зборнік "Рыжык" з аўтографам Аляксея Якімовіча, іхнія малюнкі будуць змешчаны на старонках зборніка.

"Газета Слонімская" працягвае друкаваць казкі і апавяданні Аляксея Якімовіча, якія ўвойдуць у кнігу. На наш адрас дасылайце свае ілюстрацыі да іх.

Тата пайшоў на працу, а Міколка з мамай застаўся дома. Пакрыўдзіўся на маму. Учора ён без дазволу з хлапчукамі ў лес па арэхі пайшоў, а сёння яна заявіла:

— На вуліцу не пушчу. У хаце сядзі. Другі клас скончыў, а паводзіць сябе не ўмееш.

Канешне, хвалявалася мама, шукаючы яго, але магла б дараваць. Ён у яе прабачэння папрасіў.

Міколка стаяў каля акна, кірпатым носікам прыціснуўшыся да шыбіны. За акном, у агародчыку, расце вішня. На ёй спелыя вішанькі вісяць, галінкі ўніз гнуцца.

У пакой зайшла мама. А Міколка кірпатым носікам мацней да шыбіны прыціснуўся. Не, ён не павернецца, не гляне на маму. Няхай яна ведае, што пакрыўдзіўся на яе.

— Сынок! — мякка прамовіла мама.

Хлапчук уздрыгануў, сціснуў губы, а яны па-здрадніцку задрыжалі.

— Сынок! — паўтарыла мама гэтак жа мякка і ласкава. — Схадзі, курэй пакармі. Я хачу спячы пірог. Тату вечарам пачастуем.

Міколка стаяў як скамянелы. "Можа, я прырос да падлогі?" — са страхам падумаў ён і варухнуў нагою, пасунуўшы яе ўбок.

— Сынок, пойдзеш? — напомніла мама.

Міколку захацелася кінуцца да яе і абняць, тварам прытуліўшыся да грудзей, але ён стрымаў сябе: сціснуў худыя кулачкі і прыкусіў губу.

— Сынок, навошта ты на сябе вожыкаву шкуру надзеў? — з дакорам прагаварыла мама і, цяжка ступаючы, выйшла з хаты.

Да Міколкавага горла падступіў даўкі камяк, а на вачах выступілі слёзы. Дрыготкімі пальцамі ён правёў па твары, які аж гарэў. Скура на твары гладкая, не калючая, як у вожыка. Чаму ж так сказала мама пра яго?

Яна ўжо стаіць на ганку, у руках вялікую міску з зернем трымае. На яе ілбе, заўважыў Міколка, маршчынкі шчыльна сышліся.

— Цып-цып-цып! — клічучы курэй, звонка, па-дзявочаму гукнула мама і на Міколку з усмешкай зірнула.

Куры тут як тут. Пазбягаліся, таўкуцца каля ганка. І чырвоны, як вогнішча, певень разам з імі паважна топчацца. А мама зверху сыпле ім зерне і на сына час ад часу пазірае.

Міколку чамусьці стала прыкра і сорамна. Раней ён карміў курэй.

— Цып-цып-цып, цып-цып-цып! — гукаў звонка, як мама, і радасць напаўняла ягоныя грудзі.

А потым ён расказваў маме, як дзве чубаткі пабіліся, а певень іх разбараніў.

Можа, адчыніць акно і папрасіць яе, каб яму міску з зернем дала?

Міколка глянуў на маму і нагадаў, як яна сказала з папрокам, што вожыкаву шкуру на сябе надзеў. Не, ён нізашто не адчыніць акно, не даруе.

— Цып-цып-цып! — крыкнула мама і ўсміхнулася сыну так ласкава, што ён, забыўшыся пра ўсё, адчыніў акно.

Свежы ветрык дыхнуў яму ў твар.

— Ма-ма! — па складах, як маленькае дзіцё, прамовіў Міколка і адкрыў рот, чакаючы, што скажа яму мама. Ці паспагадае яна?

Мама падышла да акна і мяккай цёплай рукой пагладзіла непадатлівы сынаў віхор. А куры абступілі яе. "Ко-ко-ко...", — на ўсе лады выводзяць. Што ж, есці хочуць, зерня просяць.

Міколка апусціў руку ў міску, набраў жменю буйнага зерня і сыпнуў на зямлю. Узрадаваліся куры, старанна дзюбамі запрацавалі. А агністы певень падняў галаву і на ўсю вёску пракукарэкаў, каб паведаміць людзям, што ў гэтай хаце жыве шчодры малы гаспадар.

А мама глядзіць на сына, вачэй не зводзіць, любуецца ім. Міколка засаромеўся, апусціў галаву і прагаварыў:

— Мамачка, ты сёння пірагі будзеш пячы?

На маміным ілбе разгладзіліся маршчынкі, памаладзела яна.

— Буду, сынок. Цеста ўжо расчыніла.

Хлапчук падняў галаву, расправіў плячукі і, шмаргануўшы носам, сказаў:

— Я тады вішанек нарву. Мы з табой, мамачка, наварым вішнёвага варэння і тату пачастуем пірагом з варэннем.

Мама абняла Міколку за плечы і прагаварыла:

— Сынок, як добра, што ты скінуў з сябе вожыкаву шкуру!

Аляксей ЯКІМОВІЧ

КРУПНЫМ ПЛАНОМ

В СБОРНУЮ СТРАНЫ ПРОСТО ТАК НЕ ПРИГЛАШАЮТ

Многим слонимским болельщикам симпатичен нападающий "Коммунальника" Андрей Мисюк. И многие уже не представляют себе команду без него. А ведь в Слоним Андрей приехал всего-то в прошлом году.

Андрей Мисюк в игре против гомельского "ЗЛиНа"

— Андрей, вы уже два года в команде. Расскажите, пожалуйста, как и где вы начинали заниматься футболом.

— В Гродно, в ДЮСШ №6 под началом тренера Емельянченко. Потом за дубль гродненского "Немана" играл, попробовал себя в Минске. Ну, а после уж появилось предложение выступать за "Коммунальник". Это было в прошлом году.

— Что можете сказать о нынешнем составе слонимской команды?

— Молодые ребята, хороший коллектив. Уже сыгрались. И в этом, наверное, большая заслуга нашего тренера Бориса Михайловича Лазарчика.

— В игре против "Осиповичей" вас не было видно на поле в составе "Коммунальника". Довелось слышать, что вы были где-то на сборах в Минске?

— Мы проводили отборочные игры с литовцами на чемпионат мира среди военнослужащих. Из Слонима были я и Максим Горбач. К сожалению, этот матч мы проиграли 0:1. Следующая игра будет в Германии. Там посмотрим... Должны выиграть и выйти в следующий этап.

— Игра в сборной страны, пусть даже и вооруженных сил, о чем-то говорит. Значит, заметили вас в Минске?

— Раз вызвали, значит, заинтересовались нашей игрой, и мы устраиваем тренеров.

— В последнее время об игре "Коммунальника" складывается такое впечатление, что слонимцы матчи с сильными командами проводят лучше, чем с середнячками чемпионата.

— Я бы так не сказал. На все игры настраиваемся одинаково серьезно. Так уж получается, что с лидерами "бьемся". Но это не значит, что со слабыми соперниками играем с меньшей ответственностью.

— Отдых — тоже дело ответственное. Как вы проводите свободное время?

— По-разному. Обычно — в общежитии, иногда в город сходишь погулять. Но в Слониме не много мест, где можно было бы отдохнуть. Поэтому чаще всего расслабляешься с хорошей книгой. Больше нечем заняться. Слоним — не Гродно.

— Какие перспективы "Коммунальника" на сезон? В первую пятерку турнирной таблицы войдете?

— Если выигрывать во всех оставшихся матчах, то очень даже может быть. А получится или нет, посмотрим в конце чемпионата.

— Свою дальнейшую футбольную судьбу связываете со слонимским клубом, или, возможно, уже есть предложения более заманчивые?

— Пока буду играть за "Коммунальник", а в более отдаленное будущее заглядывать не будем.

Александр ЗАХАРЕНКО

ФУТБОЛ. ПЕРШАЯ ЛІГА

"ЛІДА" ПАЙШЛА Ў АДРЫЎ

ФК "Ліда" — "Камунальнік" (Слонім), 2 – 0

Ліда. 21 верасня.

Гарадскі стадыён. 2 000 гледачоў.

Суддзя: С. Сахарэвіч (Гродна).

"Камунальнік": Курыловіч, Вольскі, Майсейчык (Горбач, 77), Асіпенка, Плют, Цыганенка (Лапко, 66), Варанцоў, Астапчык, Яўсеенка (Місюк, 63), Аначэнка, Зюлеў.

Галы: Петрушэўскі, 60 (з пенальці), Сафронаў, 72.

Вуглавыя: 4 (2+2) – 2 (2+0).

Удары па варотах: 15 (9+6) – 10 (3+7).

Удары ў "рамку": 7 (3+4) – 5 (1+4).

Афсайды: 3 (1+2) – 1 (0+1).

Фалы: 15 (9+6) – 16 (5+11).

Сустрэча суседзяў па турнірнай табліцы пачалася з атак гаспадароў поля. Хвілін на 5 яны прыціснулі гасцей да сваіх варотаў. Але потым гульня выраўнялася.

Лідчане білі па варотах "Камунальніка" часцей, вось толькі дакладнасцю гэтыя ўдары не вызначаліся. Ды і Курыловіч гуляў добра. У гасцей запомніліся два ўдары Варанцова, таксама безвыніковыя.

Пачатак другога тайма нагадваў дэбют сустрэчы. А лік быў адкрыты на 60-й хвіліне. Фол супраць іграка лідчан у штрафной слонімцаў быў пакараны 11-метровым, 1:0. Прапусціўшы гол, "Камунальнік" актывізаваўся. Але прыкрая памылка ў абароне Майсейчыка дазволіла гаспадарам падвоіць лік матчу.

Апошнія 15 хвілін гульні прайшлі з успleскамі абоебаковай грубасці, якая ніяк не паўплывала на зыход сустрэчы. Пройгрыш "Камунальніка", 2:0.

Пасля гэтай гульні "Ліда" у турнірнай табліцы адарвалася ад слонімскай каманды ўжо на чатыры ачкі.

Свой наступны матч слонімцы праводзяць дома ў нядзелю, 29 верасня, супраць "Тарпеда-Кадзіна". Пачатак сустрэчы на стадыёне "Дынама" ў 16 гадзін.

Аляксандр ЗАХАРАНКА

Вынікі матчаў 25-га тура:

Нёман – Смаргонь, 2-1
Дынама-Юні – Нафтан, 0-3
Дарыда – Ведрыч-97, 3-0
Лакаматыў – ЗЛіН, 3-0
Хімік – Бяроза, 1-0
Тарпеда-Кадзіна – Асіповічы, 7-0
Граніт – Днепр-ДЮСШ-1, 3-1

Турнірная табліца пасля 25-га тура

	гульні	В	Н	П	ачкі	мячы
1. Дарыда	25	18	5	2	59	71-20
2. Нафтан	25	17	5	3	56	49-20
3. Граніт	25	16	5	4	53	32-16
4. Ведрыч-97	24	16	2	6	50	49-21
5. Лакаматыў	24	15	5	4	50	46-15
6. ЗЛіН	25	11	3	11	36	34-29
7. Ліда	24	10	4	10	34	34-37
8. Днепр-ДЮСШ-1	24	8	6	10	30	31-36
9. Камунальнік	25	8	6	11	30	22-36
10. Тарпеда-Кадзіна	25	8	5	12	29	35-35
11. Нёман	25	8	5	12	29	29-40
12. Дынама-Юні	23	8	1	14	25	31-38
13. Хімік	25	7	4	14	25	22-39
14. Смаргонь	25	6	4	15	22	16-31
15. Бяроза	25	6	3	16	21	34-51
16. Асіповічы	25	2	3	20	9	14-85

ГРЭБЛЯ

ПЯТИКРАТНЫЙ ЧЕМПИОН

На личном чемпионате Беларуси по гребле на байдарках и каноэ, который состоялся в Минске (Заславль), пять золотых медалей завоевал слонимчанин Алексей Кульгавый.

Воспитанник слонимской школы гребли Алексей Кульгавый

Воспитанник тренера Игоря Царука пришел к финишу первым на дистанциях 1 000 м в каноэ-одиночке, 500 м в каноэ-двойке и в каноэ-четверке на 200 м, 500 м и 1 000 м. Несколько хуже выступили Андрей Дубина (пятый результат в каноэ-четверке на 500 м и 1 000 м) и Дмитрий Лойко (пятое место в байдарке-одиночке).

Показанного результата Дмитрию хватило, чтобы подтвердить звание "Мастера спорта".

В минувший понедельник Алексей Кульгавый приехал в Слоним, встретился со своим первым тренером, и, заодно, дал интервью для читателей "ГС".

Это интервью с пятикратным чемпионом Беларуси читайте в следующем номере газеты.

Валерий КОВАЛЕНКО

ШАШКІ

СЛОНІМЕЦ ЛЕДЗЬ НЕ ТРАПІЎ У ПРЫЗЁРЫ

У Еўпаторыі (Украіна) прайшло першынство Еўропы па шашках сярод моладзі.

Удзел у чэмпіянаце ўзялі семдзесят восем шашыстаў.

Пасляхова згуляў у спаборніцтвах слонімец Андрэй Мацявін, навучэнец СШ №9.

Ён заняў чацвёртае месца ў сваёй узроставай групе малодшых кадэтаў (хлопчыкі 1989 года нараджэння і маладзейшыя).

Яўген ІВАНОЎ

ШАХМАТЫ

КАРАЛЕЎСКІ ГАМБІТ

Прапануем аматарам шахмат мініяцюру. Партыя Макдонэль — Тісэн, Лондан, 1834 год.



1. e4. e5.
2. f4. ef.
3. Kf3. g5.
4. Cc4. g4.
5. Kc3!? (Больш удалым лічыцца гамбіт Муціа — 5. 0 – 0.)

5... gf.

6. 0-0. fg? (Памылка. Абавязковым было 6... d5)
7. B:f4. f6.

(Сем пешачных хадоў чорных прывялі іх да безнадзейнай пазіцыі. На лепшае 7... Kh6. Было 8. Гh5. Гe7. 9. Kd5! Гc5. 10. d4. 10... Г:c4 (10... Г:d4. 11. Ce3) 11. Гe5. Kpd8. 12. Г:h8. Шанцаў на выратаванне ў чорных няма. (12... Kpe8. 13. b3. Гc6. 14. Bf6.)).

8. Гh5. Kpe7.
9. Гf7. Kpd6.

(Глядзіце дыяграму)

Што ж далей?

10. e5! Kp:e5. (На 10... fe. з'яўляецца 11. Гd5. Kpe7. 12. Г:e5)

11. Be4.

Усё. (11... Kpd6. 12. Гd5x, 11... Kpf5. 12. Гh5x)

Да сустрэчы ў наступных нумарах "ГС".

Уладзімір ЛІЦЬВІН

ФУТБОЛ. ПЕРШАЯ ЛІГА

УСЁ ВЫРАШЫЛІ ШТРАФНЫЯ

У гэтым туры мастоўскі "Нёман" прымаў на сваім полі футбольны клуб са Смаргоні. Нешматлікія балельшчыкі пабачылі гульню роўных па класу каманд.

У другім крузе стартавы склад мастаўчан стабілізаваўся, толькі ў гэты раз на поле не выйшаў капітан каманды Алег Вярбіцкі, і яго замяніў Хільмановіч. Капітанскую павязку надзеў Коцка.

Пачатак гульні для гаспадароў поля быў напружаным. Два разы на выхадзе памыляецца варатар Шыдук, але двойчы выпраўляе свае памылкі. І тут памыляюцца госці, на дзевятай хвіліне сустрэчы яны збіваюць у сваёй штрафной пляцоўцы Кітурка, пенальці рэалізуе Белаш. Каманды працягваюць атакаваць. Большасць удараў трапляюць у перакладзіну варотаў ці штангу. На полі гучыць шмат непрыстойных слоў, асабліва гэтым злоўжываюць госці. Не адстае і іх трэнер. Урэшце, каб спыніць лішнія выказванні, суддзя выкарыстоўвае жоўтую картку, а ў другой палове сустрэчы выдаляе трэнера смаргонцаў за межы поля. На саракавой хвіліне матчу суддзя прызначае штрафны ў вароты гасцей. Б'е Руцько прыкладна з метраў 30 ад варотаў у абвод сценкі, і мяч трапляе ў бліжэйшы вугал варотаў.

У другой палове сустрэчы гульня праходзіла па такім жа сцэнарыі. Нічога навага не ўнеслі і замены ў складзе камандаў. Напрыканцы сустрэчы мастоўскія абаронцы спыняюць атаку гасцей у сваёй штрафной пляцоўцы недазволеным метадам, і суддзя прызначае пенальці. Гэты гол даваў лік да 2:1 і паставіў апошнюю кропку ў сустрэчы.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ПРОГНОЗ ПОГОДЫ по Гродненской области

25 сентября:

Небольшая облачность, без осадков, ночью и утром местами туман, ветер слабый. Температура воздуха ночью 0 –3, местами –5, днем +9+14

26, 27 сентября:

Облачно с прояснениями, в отдельных райо̂нах кратковременный дождь, ветер неустойчивый, слабый.

Температура воздуха ночью +1+6, на почве и местами в воздухе заморозки до 0-3, днем +7+12.

Информацию предоставил Гроднооблгидрометеоцентр

ГОРОСКОП НА НЕДЕЛЮ



от www.ignio.com

ОВЕН

Вы можете погрузиться в поток разнообразных деловых и личных проблем. Вам необходимо преодолеть сомнения и неуверенность в собственных силах. В понедельник постарайтесь проявлять практичность в делах и размеренность в жизни, что принесет успех в ближайшем будущем. Интересное знакомство может способствовать профессиональному успеху. Вторник принесет подъем сил, в этот день вы сможете многое успеть и ощутить чувство удовлетворенности от полученных результатов. В четверг желательно отложить поездки.

ТЕЛЕЦ

На этой неделе умение анализировать и наводить порядок в мыслях будут просто необходимы для успеха. Желательно внимательно следить за действиями своих деловых партнеров, они могут наделать массу ошибок, разгребать которые придется вам. Постарайтесь меньше говорить и больше действовать. В понедельник будут удачны поездки и начало командировок. В среду и четверг желательно не планировать ничего серьезного, а лучше отдохнуть на природе.

БЛИЗНЕЦЫ

На этой неделе вам предстоит продемонстрировать всю свою изобретательность и смелость. Действуйте решительно, и перед вами откроются новые горизонты. Ваши амбиции могут способствовать укреплению финансового положения. Однако, в середине недели возможны непредвиденные трудности, для преодоления которых необходимо приложить значительные усилия. В понедельник будет удачна встреча с деловыми партнерами, вероятны интересные предложения. В пятницу постарайтесь завершить текущие дела.

РАК

Есть вероятность, что на этой неделе вы столкнетесь с социальными проблемами. За помощью лучше обращаться к друзьям или близким родственникам. Не бойтесь проявлять активность в борьбе за свои права, действуйте смело, ведь сейчас ваши действия полностью соответствуют вашим желаниям. В понедельник вероятно знакомство с людьми, которым интересны ваши проблемы. В середине недели не будьте очень доверчивы по отношению к коллегам: многими их поступками будут руководить глубоко личные соображения, среди которых мыслей о вашем благополучии может и не оказаться.

ЛЕВ

Ваша мобильность и контактность позволит вам справиться с достаточно сложными проблемами, которые возникнут на этой неделе. В первой половине недели вам необходимо начать реализовывать ваши творческие замыслы. Во вторник друзья поддержат и помогут вам в сложившейся ситуации. В среду лучше не предъявлять претензий или требований к начальству, это приведет к конфликтной ситуации.

ДЕВА

Пора поднять свою профессиональную планку, сделайте что-нибудь для себя и своего будущего. Деловые встречи с партнерами в первой половине недели окажутся весьма успешными. В понедельник будут удачны поездки, командировки и начало путешествий. Во вторник вас может порадовать интересная информация, открывающая для вас новые возможности. В среду лучше не попадаться на глаза начальству.

ВЕСЫ

Отпустите с миром свое прошлое, отдайте долги и подведите некий итог. Вас могут ожидать интересные встречи, поездки. Возможны новые деловые предложения, но спешить с ними не стоит. Маленькие трудности легко отступят, а более серьезные только раззадорят. Рекомендуется активность и настойчивость в реализации своих планов. Благоприятно освоение новой профессии, осуществимо желание внести в свою жизнь кардинальные перемены. В понедельник вас могут порадовать долгожданные новости. В середине недели полагайтесь на свои силы.

СКОРПИОН

Вам желательно умерить свой пыл и внимательнее отнестись к деловым проектам. Излишняя спешка может привести к серьезным финансовым потерям. Во второй половине недели возможно скрытое противодействие вашим планам. Аккуратно ведите свои дела, чаще советуйтесь с доверенными людьми и специалистами, поскольку велик риск ошибок. В понедельник будут удачными поездки и командировки. Во вторник новая информация весьма заинтересует вас. В четверг лучше разобраться с мелкими, но нудными делами.

СТРЕЛЕЦ

Вам необходимо напряженно работать, чтобы добиться максимального успеха, при этом не будет порицаться смелость и натиск. Вы находитесь в прекрасной "интеллектуальной форме", воспользуйтесь этим. Успеху будут способствовать друзья и знакомые, не упустите благоприятные возможности. В понедельник удастся найти союзников в реализации проекта. Во вторник нежелательно планировать новые дела. В среду сослуживцы могут указать на недостатки в ваших проектах, спокойно и внимательно выслушайте их.

КОЗЕРОГ

Вам будет необходимо сконцентрировать свои усилия, чтобы выполнить свои деловые и финансовые обязательства. Наступает очень продуктивный период, особенно в профессиональной сфере, только не следует рисковать или соглашаться с сомнительными предложениями. Завершайте ранее начатые дела, укрепляйте связи с интересующими вас людьми. В первой половине недели будут удачными многие ваши начинания, при условии, если вы не будете болтать лишнего.

ВОДОЛЕЙ

Любая ваша инициатива на этой неделе будет востребована, пригодятся и ваши идеи. Хорошее время для воплощения в жизнь творческих планов и замыслов. Упорный труд будет оценен начальством по заслугам. Практически во всех случаях на этой неделе вас ожидает успешное общение с официальными инстанциями. Вторник может вас порадовать позитивными событиями на работе и в личной жизни, однако не теряйте голову от головокружительной успешности. В среду, по возможности, устройте себе день отдыха на природе.

РЫБЫ

Эта неделя может вас многому научить. Вам предстоит пересилить себя и освободиться от ряда комплексов, которые затрудняли вашу жизнь. Во всех делах от вас потребуется соблюдать порядок. На службе вас ожидают большие успехи, если вы не будете размениваться на мелочи. Неделя удачна для обретения дополнительного источника дохода. В понедельник прилив энергии и прекрасное самочувствие заставят вас решительно действовать.

анекдоты

☺ 😐 ☹

На очередной гулянке мужик мечтательно вспоминает:

- Никогда не забуду, как прошлый раз напился - ничего не помню...

☺ 😐 ☹

Жена мужу:

- Приходил твой друг Сидоров...
- И что он сказал?
- Он сказал, чтоб ты не ходил сегодня на рыбалку, потому что пивная закрыта на ремонт.

☺ 😐 ☹

- Когда я покупал у вас машину, вы обещали в течение года менять все, что у меня испортится или поломается. Это так?
- Конечно.
- Тогда дайте мне четыре нижних зуба, левую берцовую кость и два ребра.

☺ 😐 ☹

Жена говорит мужу:

- Сегодня я развеяла миф о мужском превосходстве. Я сама заменила прокладку в кране и при этом не выпила шесть бутылок пива, никого не ругала и не бегала три раза в магазин сантехники.

☺ 😐 ☹

Едет Илья Муромец по дороге. Видит камень. На камне написано:

"Направо поедешь - коня потеряешь, налево поедешь - доспехи потеряешь, прямо поедешь - козлом станешь".

Прочитал Илья, осерчал: "Это мне - русскому богатырю - козлом!!!" и поехал прямо. Смотрит, в реке Змей Горыныч купается. Илья не долго думая, спрыгивает с коня, достает меч-кладенец, одну голову отрубил, вторую. Третья голова выныривает, видит все что случилось, обращаясь к Илье:

- Илья, и кто ты после этого???!!!"

☺ 😐 ☹

Молодой муж говорит жене:

- Ты мне не поверишь, но этот суп я испек сам.

☺ 😐 ☹

Это не любовь зла... Это козлов очень много...

Кроссворд от Дмитрия Трофимовича

Венгерское вычёркивание

В буквенном хаосе спрятаны слова, приведённые ниже, которые необходимо найти и вычеркнуть. Слова читаются по вертикали, горизонтали, слева направо, справа налево, могут ломаться, изгибаться, но не по диагонали. Одно слово я уже вам подсказал. Удачи.

С	К	У	К	Г	О	Д	Ш	О	Т	О	С	Е	Т	А
К	Р	Л	Ё	З	И	Л	Т	Р	Б	Р	А	Н	В	О
Г	Я	Д	И	О	Ю	Л	М	И	Х	П	Л	С	Т	Г
А	Л	О	Я	О	З	И	У	Т	К	О	У	С	Ы	Р
М	Е	Р	А	П	Н	О	Ф	Н	Е	Р	К	У	З	Н
С	Н	К	А	С	И	М	Т	У	М	А	С	Н	Л	Е
А	И	П	Н	Т	Н	У	А	Р	Т	Б	И	П	Е	Ф
П	Ш	Е	О	К	И	Ц	И	Н	С	Л	С	О	А	Р
О	А	Р	С	А	Н	И	П	И	Т	Ь	Т	Е	З	О
Г	Ю	Л	А	Е	А	Т	А	Л	Е	Т	Ь	О	И	С
О	Р	У	Ж	И	Т	А	Л	А	Г	А	О	Л	Р	И
А	К	Е	Л	П	М	Е	Е	Н	У	Й	Г	К	Ш	С
Т	А	Ч	И	О	Х	Л	Ь	Т	П	А	И	Е	У	М
А	К	А	П	Р	А	М	М	П	О	Л	З	Т	Ё	Р
Л	И	Ф	Т	О	Г	Р	А	С	М	О	М	А	Г	А

~~Скряга~~, год, смола, сапог, лифт, оружие, грызун, атака, ниша, муниципалитет, штрих, искусство, нелепость, программа, корабль, иллюзионист, канат, кулёк, юла, мелодия, муфта, инструмент, отброс, фразеологизм, Осирис, мушкетер, ага, планета, зоопарк, персона, попугай, похмелье, талант, качели.

ОТВЕТЫ НА КРОССВОРД "Литературный"

По горизонтали

7. Лопахин. 8. Катенин. 11. «Лесозавод». 12. Тугаринов. 14. «Отрок». 15. Каверин. 16. «Чайка». 19. Перро. 20. «Вий». 21. Навои. 24. Сонет. 25. Потье. 29. «Набег». 30. Гай. 31. Лацис. 36. Казак. 37. Ромашов. 38. Асеев. 41. «Товарищам». 42. Сарыханов. 43. Монолог. 44. Погодин.

По вертикали

1. Кобетта. 2. Баробошев. 3. «Титан». 4. Бажан. 5. Великатов. 6. Кимонко. 9. Колас. 10. Гулиа. 13. Нерис. 17. Триолет. 18. Бальзак. 22. «Лес». 23. Поп. 26. Карабанов. 27. «Манас». 28. Ликстанов. 32. Сафонов. 33. Роман. 34. Зобар. 35. Меропия. 39. Сизов. 40. Сысой.

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Віктар ВАЛАДАШЧУК

ЗАСНАВАЛЬНІК Віктар ВАЛАДАШЧУК

Наш адрас: 231800, г.Слонім, вул. Камсамольская, 8.

Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
.... 4-79-34
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.
Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

Падпісана да друку
24 верасня 2002г.
Час падпісання 18:00.

Надрукавана
ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г.Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

E-MAIL: gs@promedia.by HTTP://gs.promedia.by Аб'ём — чатыры друкаваныя аркушы

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)

ЗАКАЗ № 2545

© «Газета Слонімская» Спасылка на «ГС» абавязковая
(К) Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

"Газета Слонімская" Комсомольская,8
КБУ
Магазин "Юбилейный"
Комсомольская
К. Давыдюк
Я. Купалы